## Партнёры

# Адкрываем новыя старонкі супрацоўніцтва

### Такія магчымасці дорыць Шаўковы шлях

**У Мінску адбылося другое пасяджэнне Беларуска-кітайскага міжурадавага камітэта па супрацоўніцтве. Бакі адзначылі, што работа камітэта з'яўляецца значнай для прасоўвання беларуска-кітайскага ўсебаковага стратэгічнага партнёрства.**

Сустаршынёй камітэта з беларускага боку выступіў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Мікалай Снапкоў, з кітайскага — член Палітбюро ЦК Камуністычнай партыі Кітая, сакратар палітыка-юрыдычнай камісіі ЦК КПК Мэн Цзяньчжу.

Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта звярнуў увагу, што сяброўскія адносіны паміж Беларуссю і Кітаем актыўна і плённа развіваюцца на працягу 24 гадоў.

— Сумеснае будаўніцтва праекта «Эканамічны пояс «Шаўковы шлях» адкрывае перад намі шэраг новых фарматаў шматбаковага сумеснага ўзаемадзеяння на еўрапейскім кантыненце. Мы бачым перспектывы супрацоўніцтва ў фармаце «16+1»: краіны Цэнтральнай і Усходняй Еўропы плюс Кітай. Далучэнне Беларусі да ўдзелу ў гэтым фармаце дасць новыя магчымасці для нашага ўзаемадзеяння.

Па словах Мікалая Снапкова, адным з элементаў стратэгічнага супрацоўніцтва Беларусі і Кітая з'яўляецца рэалізацыя Кітайска-беларускага парка «Вялікі камень».

— Парк — гэта самы важны на сёння і на бліжэйшую перспектыву ўзорны сумесны праект, — упэўнены намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

Па выніках пасяджэння Беларуска-кітайскага міжурадавага камітэта па супрацоўніцтве быў падпісаны пратакол. У цэлым падчас візіту кітайскай дэлегацыі дасягнуты шэраг дамоўленасцяў па працягу актыўнага супрацоўніцтва ў крэдытна-фінансавай сферы, прасоўванні будаўніцтва Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка, актывізацыі міжрэгіянальных кантактаў, стварэнні спрыяльных умоў для рэалізацыі сумесных праектаў.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

## Парламенцкі дзённік

# «Пытанне аб інвестыцыях — ключавое ў развіцці эканомікі»

**Такую думку выказаў Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі падчас нарады па доўгатэрміновых спецыяльных інвестыцыйных дагаворах. Спікер верхняй палаты беларускага парламента адзначыў адмоўныя тэндэнцыі ў інвестыцыях (падзенне на 18% у параўнанні з мінулым годам) і ў іх структуры.**

«Доўгатэрміновыя інвестыцыйныя крэдыты — гэта асаблівая форма, якая дазваляе не толькі рэалізаваць інвестыцыйны праект, але галоўнае — думаць пра тое, што чакае пасля. Бо ўсе асноўныя праблемы ўзнікаюць пасля рэалізацыі праекта. Аbabаротным капіталам прадпрыемства не надзяляецца. І вельмі высокая рызыка, што выробленая прадукцыя не будзе здольная канкурыраваць. Паколькі айчыннае прадпрыемства панесла досыць высокія выдаткі, і, натуральна, гэта паўплывала на структуру сабекошту прадукцыі. Наша галоўная задача — нарасціць аб'ём інвестыцый у асноўны капітал і стварыць пэўны рэжым для інвестгаравар, выраблены на прадпрыемствах, якія рэалізавалі інвестыцыйныя праекты», — такую задачу паставіў старшыня Савета Рэспублікі.

У нарадзе ўзяў удзел і **міністр эканомікі Беларусі Уладзімір ЗІНОЎСКІ.** «Цяпер бюджэт сціснуўся. ВУП ніжэйшы за 100% з шэрагу прычын, у тым ліку нафта-газавых пытанняў Расійскай Федэрацыі. Бюджэт зменшыўся, і мы не можам аддаць столькі сродкаў, колькі б хацелася, для інвестыцыйнай дзейнасці. Таму варта прыцягваць замежныя інвестыцыі, пажадана на чыстай аснове: не столькі крэдыты, колькі сумесны бізнес і грынфілд-праекты (кампаніі ці прадпрыемствы, збудаваныя з нуля. — Аўт.), якія хацелася б каб вырошчваліся замежнымі кампаніямі і такім чынам выраблялі на Беларусі тавары для агульнасусветнага карыстання», — лічыць ён.

Па словах міністра, сапраўды, талковых праектаў цяпер не так шмат. Бо кіраўнік прадпрыемства заўжды ў сітуацыі ўзяцця крэдыту арыентуецца на тое, каб праект хутка рэалізоўваўся. Але нестабільнасць крайн вакол Беларусі, якая залежыць і ад сыравінных сродкаў, і ад курса расійскага рубля, не дае магчымасці дакладна спрагназаваць, як аддаваць крэдытныя сродкі. «Таму шмат хто з асцярогай ставіцца да таго, каб узяць крэдыт на пераўзбраенне. Але дарэмна. Трэба бачыць шляхі паляпшэння ў развіцці прадпрыемства, — перакананы Уладзімір Зіноўскі. — Што тычыцца прамых інвестыцый, то беларускі рынак для замежнікаў — гэта перспектыва выхаду на рынак як Еўрапейскага саюза, так і Еўразійскага эканамічнага. Таму тут ствараць канкурэнтную прадукцыю і прадаваць яе для замежніка павінна быць прывабна».

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне Старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, дэпутату Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога, трэцяга і чацвёртага скліканняў Ордзе М.С. у сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

**Супрацоўнікі Выдавецкага дома «Звязда» выказваюць шчырыя спачуванні Старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, дэпутату Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога, трэцяга і чацвёртага скліканняў Міхаілу Сяргеевічу Ордзе ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

## Выбары-2016

# БЕЗ ПРАВА НА ПАМЫЛКУ

### Навошта ў выбарчай камісіі настаўнікі замежнай мовы?

Для **Вольгі ЛАШАНКОВАЙ, старшыні Пралетарскага выбарчага участка №38 у Чавусах,** гэта ўжо 8 выбары. Справу, як той казаў, ведае знутры. І за членаў выбарчай камісіі спакойная: усе яны людзі вопытныя, з 9 чалавек толькі 1 навічок, ды і той меў у мінулым дачыненне да выбараў, праўда, у якасці назіральніка. Кожны прадстаўнік карыстаецца аўтарытэтам сярод таварышаў, нехта вылучаўся працоўным калектывам, нехта грамадскай арганізацыяй (Саюзам жанчын, БРСМ, «Белай Руссю»). Сярод вылучэнцаў ёсць бухгалтар, метадыст, медработнік, спецыяліст аддзела, настаўнікі, нават два выкладчыкі нямецкай і англійскай мовы. Так што, калі спатрэбіцца, змогуць растлумачыць нюансы выбарчага заканадаўства тым жа міжнародным назіральнікам. Кожная кандыдатура была разгледжана на пасяджэнні райвыканкама і зацверджана аднагалосна.

Участак знаходзіцца ў будынку раённага Цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі. Чырвона-зялёную шыльду з яго нумарам відаць здалёк. Калі падыходзіш бліжэй, можна пачытаць графік работы ўчастка. Працуе ён пакуль у свабодным рэжыме, адну гадзіну ў дзень — з 17.00 да 18.00. «Гэты час самы зручны для жыхароў, — кажа Вольга Лашанкова. — Большасць людзей якраз вяртаецца з работы, і пытанні, якія хваляюць, можна вырашыць па дарозе дадому. Але гэта не значыць, што члены камісіі даступныя толькі ў гэты час. Горад у нас маленькі, усе адзін аднаго ведаюць. Акрамя гэтага, адзін з членаў камісіі працуе бухгалтарам спартыўнай школы, якая размяшчаецца ў тым самым будынку, дзе і ўчастак. Яна заўсёды зможа праконсультаваць».

Цяпер асноўныя клопаты звязаны з выверкай спісаў выбаршчыкаў і падрыхтоўкай неабходнага абсталявання. Устанаўліваюцца кабіна для галасавання, скрыні. Закупляюцца лупы для тых, хто слаба бачыць, ліхтарыкі. Трэба быць гатовымі да ўсяго.

Наведвальнікаў пакуль не шмат. У асноўным заходзяць або тэлефануюць людзі, якія пераехалі на новае месца жыхарства, але не паспелі там прапісацца. Гэтымі днямі завітала жанчына, якая прапісана па іншым адрасе, а жыве на тэрыторыі, замацаванай за ўчасткам.

— Усё праходзіць у звычайным рэжыме, — запэўнівае Вольга Пятроўна. — Нейкіх там пазаштатных сітуацый не ўзнікала. Не было іх і ў мінулыя выбарчыя кампаніі. Здараліся выпадкі, калі людзі прыходзілі з пашпартамі сваіх бацькоў або бабулях ці дзядуляў. Мы тлумачым, што на выбарах кожны павінен галасаваць толькі за сябе. Выбачаем, наколькі неабходна чалавеку наша дапамога, ці трэба выехаць на дом. Нагадваем, што ў выязным рэжыме мы працуем непасрэдна толькі ў дзень выбараў.

Усяго ў Чавускім раёне працуе 25 участковых камісій складам па 9 чалавек, за выключэннем бальнічнага ўчастка, дзе 5 чалавек, а таксама Благавіцкага і Гагарынскага, дзе па 7 чалавек, паколькі колькасць выбаршчыкаў там крыху меншая.

— У склад камісій вылучана 217 прадстаўнікоў, 46 з якіх шляхам падачы заяў, 35 — працоўнымі калектывамі і 136 — грамадскімі аб'яднаннямі. Грамадскае аб'яднанне «Белая Русь» прадстаўляе 12 чалавек, БРСМ — 11, Беларускі саюз жанчын — 8, Беларускае аб'яднанне ветэранаў — 17 і іншыя грамадскія аб'яднанні з ліку прафсаюзных пярвічак 88 чалавек. Амаль 80% членаў камісій жанчыны. З моладзі да 30 гадоў задзейнічаны 11 чалавек. Больш за 93% вылучэнцаў (209 чалавек) маюць вопыт работы ва ўчастковых камісіях, яшчэ 3,7% (8 чалавек) таксама вопытныя, але працоўць у камісіях на новых пасадах, — адзначыла **член акруговай камісіі Магілёўскай сельскай выбарчай акругі №88, начальнік арганізацыйна-кадравай работы Чавускага райвыканкама Наталля КАМАРОВА.**

Спрэчных пытанняў па вылучэнні ў склад камісій, запэўніла яна, не ўзнікала, колькі было пададзена заявак, столькі чалавек і зацверджана. Кожная кандыдатура абмяркоўвалася на пасяджэнні райвыканкама і ніякіх прычын адхіліць яе не было.

Непасрэдна ў Чавусах працуе 9 участкаў, адзін з якіх у бальніцы. Усе ўчасткі абазначаны, на ўваходзе кожнага размешчаны графік работы ўчастковай камісіі. Па заканадаўстве, на сустрэчу з выбаршчыкамі на гэтым этапе кампаніі адводзіцца адна гадзіна часу. Чалавек можа зайсці, каб упэўніцца, ці ёсць яго прозвішча ў спісах, або высветліць нейкія іншыя нюансы, якія датычацца выбараў. У астатні час члены камісій ходзяць па дамах, удакладняюць спісы выбаршчыкаў, рыхтуюць кабіны, стэнды.

— Да 26 жніўня спісы выбаршчыкаў будуць выверaны і зацверджаны старшынямі рай-, сельвыканкамаў, — кажа Наталля Камарова. — Да гэтага часу на ўчастках будуць усталяваны стэнды, і час работы камісій падоўжыцца да 2 гадзін у дзень, а з 6 па 10 верасня, падчас датэрміновага галасавання, да 4 гадзін у дзень. Непасрэдна ў дзень выбараў, 11 верасня, камісіі будуць працаваць з васьмі гадзін раніцы да васьмі вечара.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

### Каментарый у тэму

**Старшыня абласной выбарчай камісіі Валерый БЕРАСТАЎ:**

— На тэрыторыі Магілёўскай вобласці створана 767 участкаў для галасавання па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання, у іх склад увайшлі 8397 чалавек. Органы, якія стварылі камісіі, строга выконвалі патрабаванні Выбарчага кодэкса. У склад камісій увайшло менш за 4% дзяржслужачых і больш за 40% прадстаўнікоў палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў. Тры чвэрці членаў камісій — жанчыны. Моладзі да 30 гадоў задзейнічана 8%. Шляхам падачы заяў у камісію прайшло 39%, ад працоўных калектываў 17,1% і ад грамадскіх аб'яднанняў — 43,3% прадстаўнікоў. Больш за ўсё ў камісіях членаў Федэрацыі прафсаюзаў, «Белай Русі», БРСМ, Саюза жанчын, ветэранскай арганізацыі. Ад палітычных партый большасць прадстаўлена Камуністычнай партыяй Беларусі, Аб'яднанай грамадзянскай партыяй, Рэспубліканскай партыяй працы і справядлівасці. Выкананы патрабаванні Выбарчага кодэкса на прадмет забароны вылучэння ў камісіі суддзяў і пракурорскіх работнікаў. Няма там і кіраўнікоў выканаўчых і распарадчых органаў.

# Рыхтуемся да Дажынак

### Ураджай практычна сабраны

**Засталося некалькі дзён да завяршэння ўборачнай кампаніі ў краіне. Па аператыўнай інфармацыі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, з палёў убрана 6,6 млн тон збожжа пры ўраджайнасці ў 33,8 ц/га. Жніво завершана на 92,4% пасяўных плошчаў.**




Больш за ўсё сабралі аграрыі Мінскай вобласці. Там валавы збор збожжа склаў 1,73 млн тон. Далей ідуць гаспадаркі Брэстчыны, дзе сабралі больш за 1,1 млн тон збожжавых і зернебабовых культур. У Гродзенскай і Гомельскай абласцях сабралі 1098,9 і 1070,8 тысячы тон адпаведна. Варта таксама адзначыць, што дзяржзаказ па пастаўцы харчовага збожжа выканалі чатыры раёны Гомельскай вобласці. У ліку перадавікоў сельскагаспадарчыя арганізацыі Ельскага, Жыткавіцкага, Лоеўскага і Мазырскага раёнаў. Дзяржзаказ выкананы імі як па аб'ёме, так і ў разрэзе культур. У цэлым па стане на раніцу 22 жніўня дзяржзаказ па пастаўках збожжа ў вобласці выкананы на 89,6%. У збожжасховішчы паступіла 129,9 тысячы тон. Аграрыі Гомельшчыны цалкам разлічыліся па пастаўках жыта, якога рэалізавана 56,6 тысячы тон (103% да плана). План па пшаніцы выкананы на 83,5%, аўсе — 86,7%, ячмені — 82,9%. Поўнасцю выканаць дзяржзаказ гаспадаркі вобласці плануюць да канца гэтага тыдня.

У Магілёўскай вобласці наблiжаюцца да збору ўраджаю ў 1 млн тон, а на Віцебшчыне ўбралі толькі 67,5% пасяўных плошчаў і валавы збор склаў 642 тысячы тон. Найбольшая ўраджайнасць назіраецца на тэрыторыі Гродзеншчыны — 37,4 ц/га.

Акрамя таго, па ўсёй краіне пачынаецца актыўная падрыхтоўка да восеньскіх кірмашоў. Так традыцыйна ўздел у распродажах плодаагароднінай і мяса-малочнай прадукцыі прымуць усе рэгіёны краіны: Брэсцкая вобласць — 17 і 18 верасня, Віцебская — 24 і 25 верасня, Гомельская — 1 і 2 кастрычніка, Гродзенская — 8 і 9 кастрычніка, Мінская — 15 і 16 кастрычніка, Магілёўская — 22 і 23 кастрычніка. Заключны кірмаш 29 і 30 кастрычніка збяро ў Мінску ўсе рэгіёны. Усяго ж у сталіцы кірмашоў за восень чакаецца больш за 150. Кірмашы выхаднога дня пройдуць з 17 верасня па 30 кастрычніка на пляцоўках каля комплексу «Чыжоўка-Арэна» і ва ўсіх адміністрацыйных раёнах горада. Акрамя таго, 1, 2, 8 і 9 кастрычніка плануецца правесці кірмашы на пляцоўцы каля Палаца спорту.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *Kryzhevich@zviazda.by*